УДК 72.05:296.735(476.6)

# ПОМНІКІ МУРАВАНАГА ДОЙЛІДСТВА АСТРАВЕЦКАГА РАЁНА Ў ТУРЫСЦКА-ЭКСКУРСІЙНЫМ ПАКАЗЕ

*М.К. ШАЎЛІС*
*(Прадстаўлена: І.У. ВАТКІНС)*

Астравеччына – адзін з прыгажэйшых куткоў заходняй Беларусі. Яна ўражвае даволі разнастайным рэльефам – палогія раўніны Нарачана-Вілейскай нізіны мяжуюць з узгоркамі Ашмянскага ўзвышша, якія надаюць мясцовасці адметны воблік. Па тэрыторыі раёна працякае рака Вілія з вялікай колькасцю прытокаў. Гонарам прыроды раёна з’яўляецца знакаміты ландшафтны заказнік “Сарачанскія азёры”. Прыгажосць і адметнасць прыроды рэгіёна аздабляецца помнікамі старажытнага дойлідства, якія ўражваюць сваёй узнёсласцю і велічнасцю.

Астраўчане з даўніх часоў з вялікай павагай ставіліся да Бога. Сведчанне таму — велічныя высокамастацкія храмы, шматлікія каплічкі. Яны даносяць да нас многавяковую гісторыю народа, шматпакутны лёс нацыі, яе імкненне да зямнога дабрабыту, міру, ушанавання рэлігійных, агульначалавечых ідэалаў. Храмы — гэта святыні, якія беражліва, з пакалення ў пакаленне, народ ахоўваў ад гістарычных катаклізмаў, каб перадаць у будучыню ўвасоблены ў іх неацэнны духоўны скарб, неразменную каштоўнасць — душу нацыі.

Развіццё турызму з'яўляецца адным з прыярытэтных напрамкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь. Турысцкі патэнцыял Беларусі грунтуецца, галоўным чынам, на разнастайнасці, прыгажосці і першаснасці прыроды краіны, унікальнасці гісторыка-культурнай спадчыны і складаецца з больш чым 15 тысяч аб'ектаў, якія маюць гістарычную, культурную, архітэктурную значнасць, памятных месцаў, звязаных з імёнамі выдатных дзеячаў сусветнай гісторыі і культуры.

Акрамя таго, Беларусь мае выгаднае геаграфічнае становішча. Кажуць, што чалавеку, які захоча пабываць у геаграфічным цэнтры Еўропы, трэба проста купіць білет да Мінска - сталіцы Рэспублікі Беларусь. Сёння, як і шмат стагоддзяў таму, адзначаецца вялікае транзітнае значэнне Беларусі для перамяшчэння людзей, капіталу, тавараў і паслуг на шляхах паміж Заходняй Еўропай і Расіяй, Скандынавіяй і Азіяй.

Беларусь мае выключна багаты прыродны і гісторыка-культурны патэнцыял, спрыяльны для турызму. Турызм з'яўляецца адной з найбуйнейшых галін сусветнай эканомікі, якія дынамічна развіваюцца і спрабуюць заняць належнае месца ў эканоміцы нашай дзяржавы. У цяперашні час распрацаваны шматлікія турыстычныя маршруты разнастайнай тэматыкі і напрамкаў.

Безумоўна, што ёсць неабходнасць у развіцці спецыялізаванага турызму. Калі чалавек у сілу сваёй захопленасці архітэктурным дойлідствам або прафесійных інтарэсаў хоча падрабязна вывучыць архітэктурныя, скульптурна-дэкаратыўныя асаблівасці храмабудавання, яму неабходна даць такія магчымасці.

Менавіта таму распрацаваны спецыялізаваны турыстычны маршрут (мал. 1) для падарожніка, які цікавіцца дойлідствам Беларусі, вывучае або звязаны з ім прафесійна.

Створаны спецыялізаваны турыстычны маршрут, які дазваляе пазнаёміцца з гісторыяй некаторых вёсак і храмаў Астравеччыны, падрабязна разгледзець асаблівасці архітэктуры і ўнутранае скульптурна-дэкаратыўнае аздабленне храмаў.

Першы пункт руху маршруту – Касцёл св. Міхаіла Арханёла ў в. Міхалішкі з'яўляецца найбольш старажытным помнікам мураванага культавага дойлідства на Астравеччыне, найбольш тыповым і найменш перабудаваным на сённяшні дзень помнік “сармацкага” барока [1]. Уражвае кантраст паміж сярэдневяковай дэкарацыяй фасада і пышным барочным аздабленнем інтэр’ера касцёла. Скульптуры апосталаў у гэтым храме - адны з самых дасканалых сярод твораў перыяду сталага барока Беларусі, якія былі зроблены са стуку і захаваліся да нашых дзён. На працягу 360 гадоў існавання Міхалішскага касцёла яго выгляд знадворку і ўнутры не быў зменены. Гэта адзін з 17-стагоддзевых бароккавых касцёлаў на нашых землях, якога не знішчылі пажары, войны і розныя жыццёвыя завірухі. Не перабудоўваўся, не падлягаў такім рамонтам, якія б парушылі яго першапачатковы стыль, выгляд, і найбольш прыгожае – унутранае ўбранства. Касцёл святога Арханёла Міхаіла з’яўляецца адным з найбольш старажытных помнікаў мураванага дойлідства ў рэгіёне. Гэта наша бязмернае багацце, непаўторная спадчына, якую мы павінны вывучаць ведаць і шанаваць. Хаця, касцёл св. Міхала Арханёла ў Міхалішках з’яўляецца вясковым па сваіх памерах, аднак жа ён упоўні заслугоўвае назву “жамчужыны” барокка.




Мал. 1. Схема спецыялізаванага турыстычнага маршруту “Помнікі мураванага сакральнага дойлідства Астравецкага раёна”:

А – Касцёл Святога Арханёла Міхаіла ў в. Міхалішкі; В – Касцёл Узвышэння Святога Крыжа ў в. Быстрыца; С – Касцёл святога Юрыя ў в. Варняны; D – Касцёл Святой Троіцы ў в. Гервяты; Е – Касцёл святых Космы і Даміяна ў г. Астравец; F – Касцёл Узнясення Святога Крыжа ў г. Астравец

Наступнае паселішча – Быстрыца – адно з самых старажытных на Астравеччыне. Мястэчка упершыню ўзгадана ў летапісах у 1390 годзе, калі кароль Ягайла заснаваў тут касцёл і кляштар канонікаў рэгулярных святога Аўгустына [2]. Мураваны касцёл Узвышэння святога Крыжа ў вёсцы Быстрыца быў пабудаваны на ахвяраванні парафіянаў у стылі віленскага барока ў 1760–1761 гг. Новы напрамак позняга беларускага барока, званага віленскім, у хуткім часе распаўсюдзіўся па ўсёй краіне і, зразумела, не абмінуў рэгіён, найбольш блізкі да сталіцы. Мураваны касцёл Узвышэння святога Крыжа ў вёсцы Быстрыца з’яўляецца адным з каштоўных помнікаў позняга беларускага барока, званага віленскім.

Гісторыя Варнян налічвае больш за 600 гадоў, калісьці Варняны слылі як адна з найпрыгажэйшых сядзібаў Віленскага краю. Даўні палац сышоў у нябыт, але незвычайны, пабудаваны па агульным грандыёзным плане гандлёвы і рамесны цэнтар мястэчка захаваўся з 18 ст. Галоўнай часткай унікальнага архітэктурнага ансамбля ў Варнянах з’яўляецца касцёл святога Юрыя. Юр’еўскі касцёл пабудаваны ў стылі віленскага барока ў 1760 – 1769 г. Асноўны мастацкі акцэнт, адпаведна яго дамінантнай ролі ў ансамблі, зроблены на галоўным двухвежавым фасадзе касцёла, які выступае за межы асноўнага аб’ёма і вызначаецца вытанчанасцю і ажурнасцю сілуэта [3, с. 489]. Франтальная забудова цэнтральнай плошчы практычна страціла свой першапачатковы архітэктурны выгляд. Абсалютная большасць старых дамоў з-за пераробак змяніла ранейшыя прапорцыі. Як архітэктурная дамінанта касцёл завяршаў унікальны горадабудаўнічы ансамбль, які з’яўляўся адной з першых спроб планавання мястэчка на аснове ідэй рэгулярнасці ў забудове.

Гервяты – даўняе мястэчка гістарычнай Віленшчыны. Троіцкі касцёл у вёсцы Гервяты ўвасабляе вертыкальную дынаміку і ўзнёсласць формаў. Касцёл пабудаваны ў 1899–1903 гг. у чыстым неагатычным стылі. Гэта адзін з найлепшых узораў так званых гістарычных стыляў у Беларусі, што выяўлялі нацыянальныя тэндэнцыі рамантызму [4, с. 88] Касцёл Святой Троіцы ў в. Гервяты ў 2003-м годзе адсвяткаваў свой стогадовы юбілей. Сто гадоў для касцёла - тэрмін не вельмі вялікі, многія храмы, у тым ліку астравецкія, ведаюць і больш глыбокія часы. Але як няма двух аднолькавых лёсаў у людзей, так няма іх і ў святынь. Гервяцкі касцёл - асаблівы: як сваім архітэктурным рашэннем, так і ўнутранай аздобай, і афармленнем тэрыторыі навокал – дзякуючы намаганням сённяшняга ксяндза - пробашча Леаніда Нясцюка, яна пераўтворана ў сапраўдны батанічны сад. Яшчэ адна асаблівасць Гервяцкага касцёла Святой Троіцы - тое, што ён знаходзіцца на этнічным і культурным памежжы. У Гервяцкай парафіі здавён жылі побач беларусы, літоўцы, палякі, апошнія дзесяцігоддзі - яшчэ і рускія, і ўкраінцы. І для ўсіх іх касцёл - святыня не толькі ў сэнсе абазначэння храма, а, самае галоўнае, - гэта святое месца для душы.

Астравец – горад на рацэ Лоша, адміністрацыйны цэнтр Астравецкага раёна Гродзенскай вобласці. Паводле дакументальных гістарычных звестак, Астравец – трэці па старажытнасці населены пункт рэгіёна, пасля Быстрыцы і Варнян. Упершыню назва Астравец згадваецца ў дакуменце 1468 года. Святыня ўяўляе трохнефавую базіліку з плоскай алтарнай сцяной прэсбітэрыя і фасадам-нартэксам, які па задуме мусіў быць двухвежавым. Па баках прэсбітэрыя ўкампаваны сіметрычныя сакрысціі. Усе часткі храма аб'яднаны ў строгім прамавугольньш аб'ёме, накрытым пасля перабудовы агульным двухсхільным дахам. Унутры шырокі цэнтральны неф перакрыты цыліндрычным скляпеннем з

распалубкамі на падпружных арках, бакавыя нефы — крыжовымі скляпеннямі. У інтэр'еры захоўваюцца каштоўныя абразы 18 – 19 стст.

У 1910-1911 гг. на ахвяраванні парафіян пабудаваны касцёл Узнясення св. Крыжа, своеасаблівая эклектычная архітэктура якога спалучае рысы неараманскага стылю і неаготыкі. Архітэктанічна – гэта класічная трохнефавая крыжовая базіліка, змураваная з жоўтай цэглы, якая атрымала пашырэнне ў будаўніцтве Беларусі на мяжы 19 – 20 стст. Касцёл Узнясення Святога Крыжа ў г. Астравец пабудаваны на каталіцкім цвінтары (вул. Ленінская, 7). Урачыста ўзняты на пагорак і высокі цокаль, выкладзены магутнымі вапняковымі квадрамі. Выкарыстоўваўся як гандлёвы склад. Зноў адкрыты ў 1994 г. Ля касцела быў пахаваны першы рускі консул у Японіі І.А. Гашкевіч (1814 – 1872; магіла не захавалася).

Ва ўсёй сукупнасці вытокаў і праяў касцельная архітэктура Беларусі — агульнанацыянальны гісторыка-культурны і турыстычны здабытак. Гэтыя хрысціянскія святыні арганічна ўвайшлі ў архітэктурнае і прыроднае асяроддзе краіны, сваімі манументальнымі гмахамі, вежамі, ўключыліся ў структуру гарадоў і вёсак Беларусі, фарміруючы іх маляўнічыя панарамы і сілуэты. Яны стаяць на беларускай зямлі, будаваліся ў яе гістарычным і культурным асяроддзі і з цягам часу зрасліся з гэтым асяроддзем. Дзейнасць заходняй хрысціянскай царквы пакінула ў нашай культуры прыкметны след, і ў першую чаргу гэта архітэктурныя помнікі, некаторыя з якіх лічацца агульнаеўрапейскімі шэдэўрамі, якія проста неабходна разглядаць, як турыстычны патэнцыял раёна.

Тэма комплекснага даследвання архітэктурнай спадчыны Астравецкага раёна як турыстычнага здабытка і надалей застаецца перспектыўнай для архітэктурнага і гісторыка-культурнага вывучэння.

ЛІТАРАТУРА


1. Усціменка, І.Р. Міхалішкаўскі кляштар Аўгустынцаў / І.Р. Усціменка // Аставецкая праўда. – 2004.
2. Быстрыца і яе жыхары [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.ostrovets.by/?p=2160. – Дата доступу: 09.09.2015 г.
3. Памяць. Астравецкі раён. – Мінск : Белар. энцыкл., 2004. – 480 с.
4. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі (Гродзенская вобласць). – Мінск : Белар. сов. энцыкл. імя Пятруся Броўкі, 1986. – Стар. 88.


**УДК 72.05:296.735(476.6)**

## ПОМНІКІ ДРАЎЛЯНАГА ДОЙЛІДСТВА АСТРАВЕЦКАГА РАЁНА Ў ТУРЫСЦКА-ЭКСКУРСІЙНЫМ ПАКАЗЕ

***М.К. ШАЎЛІС***
***(Прадстаўлена: І.У. ВАТКІНС)***

Рэспубліка Беларусь – дзяржава з багатай старажытнай гісторыяй, размешчаная ў цэнтры еўрапейскага кантынента на скрыжаванні гандлёвых шляхоў. Нягледзячы на існуючы турысцкі патэнцыял, сучасны стан сферы турызму ў Рэспубліцы Беларусь не займае належнага становішча ў эканоміцы краіны.

У сілу свайго геапалітычнага становішча тэрыторыя Беларусі часта станавілася арэнай ваенных дзеянняў, што абумовіла адносна невысокую ступень захавання гісторыка-архітэктурных помнікаў. Тым не менш рэспубліка мае багаты гісторыка-культурны патэнцыял, які сфармаваўся на працягу тысячагадовай гісторыі станаўлення беларускай дзяржаўнасці. На тэрыторыі Беларусі налічваецца звыш 17,5 тыс. помнікаў гісторыі і культуры, з ліку якіх больш за 2,5 тыс. аб'ектаў маюць нацыянальнае значэнне.

Зыходзячы з рэгіянальных адрозненняў рэкрэацыйна-рэсурснага патэнцыялу, турысцкай спецыялізацыі і ўзроўню развіцця рэкрэацыйных функцый, вылучаюць чатыры асноўныя рэкрэацыйна-турысцкія раёны Беларусі: Паўночны (Віцебская вобл.), Цэнтральны (Мінская вобл., Ашмянскі, Астравецкі, Смаргонскі раёны Гродзенскай вобл.), Заходні (Брэсцкая і асноўная частка Гродзенскай вобл.) і Усходні (Гомельская і Магілёўская вобл.).

Цэнтральны раён валодае найбольш развітай турысцкай інфраструктурай і канцэнтруе звыш 2/5 курортна-рэкрэацыйных устаноў і каля 1/3 рэкрэацыйных тэрыторый. Спецыялізацыя раёна вызначаецца арганізацыяй аздараўленча-турыстычнага, курортна-лячэбнага (курорты Нарач і Ждановічы) і экскурсійнага абслугоўвання.

Выгаднае транспартна-геаграфічнае становішча Астравецкага раёна спрыяе развіццю транзітнага турызму і прыгранічнага турысцкага абмену з Польшчай і Літвой. Прыродныя комплексы і гісторыка-культурная спадчына Беларусі дазваляюць распрацаваць разнастайныя турысцкія маршруты, якія